# План канспект урока беларускай мовы ў 8 класе для навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія навучаюцца па праграме першага аддзялення дапаможнай школы

**Тэма урока:** ***“Часціны мовы”***
2-гі ўрок па тэме

**Навучальная мэта:** *плануецца, што да канца ўрока вучні будуць знаць, асноўныя часціны мовы, будуць умець вылучаць назоўнік, прыметнік, дзеяслоў сярод асобных слоў і ў сказах, выканаюць заданне на класіфікацыю слоў па часцінах мовы* ***http://LearningApps.org/1470047***

**Задачы:** *садзейнічаць фарміраванню ўменняў вылучаць часціны мовы, ажыццяўляць класіфікацыю слоў па часцінах мовы; развіццю вуснай мовы; арганізаваць сітуацыю выхавання любові да Радзімы, да роднай мовы.*

Абсталяванне: *падручнік А.М. Змушко Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа дапаможнай школы з беларускай мовай навучання; карткі са складамі; камп’ютар з магчымасцю выхаду ў інтэрнэт; заданні створаныя ў сістэме* ***LearningApps.org:***
- http://LearningApps.org/display?v=pc5sbnr8n01
- **http://LearningApps.org/1470047**

ХОД УРОКА

***1. Арганізацыйны момант***

Весела звініць званок

Яго голас вам знаёмы
Ён запрасіў нас на ўрок
Беларускай мовы!

Пачынаць любую справу патрэбна з добрым настроем. Для стварэння добрага настрою давайце ўсміхнемся адзін аднаму, працягнем руку падтрымкі і ўзаемадапамогі.

**2. *Паведамленне тэмы ўрока і задач***

Давайце ўспомнім тэму, з якой мы пазнаёміліся на мінулым уроку. *Адказы вучняў.* Сёння на ўроку мы прадоўжым вывучэнне тэмы “Часціны мовы” і будзем адпрацоўваць уменне вызначаць да якой часціны мовы адносяцца словы, будзем вылучаць вядомыя часціны мовы ў сказах і тэкстах, развіваць вусную мову праз пабудаванне поўных адказаў на пастаўленыя пытанні, складанне сказаў з зададзенымі словамі.

**3. *Праверка дамашняга задання***

Каб праверыць наколькі добра вы засвоілі правілы прапаную выканаць заданне на камп’ютары http://LearningApps.org/display?v=pc5sbnr8n01)

**4. *Фізхвілінка*** *(гімнастыка для вачэй)*

**5. *Хвілінка чыстапісання***

Перад вамі знаходзяцца склады, з якіх вы павінны скласці словы. (БЕ, ЛА, РУСЬ, РЭС, ПУБ, ЛІ, КА). Якія словы ў вас атрымаліся? Што яны абазначаюць? З якой літары іх патрэбна пісаць і чаму? У сваіх сшытках прыгожа запішыце назву нашай краіны.

*Падвядзенне вынікаў работы (самаацэнка і ацэнка настаўніка).*

**6.** ***Праца па падручніку***

Практ. 189, стар. 72 Вызначыць, да якіх часцін мовы адносяцца словы.

**7.** ***Праца па падручніку***

Практ. 192, стар.73 (верш “Беларусачка” чытае настаўнік). Чаму верш мае такую назву? А як можна назваць хлопчыка, які нарадзіўся ў Беларусі? Чытанне верша вучнямі па сказах і вылучэнне назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў.

*Падвядзенне вынікаў работы (самаацэнка і ацэнка настаўніка).*

**8.** ***Фізхвілінка***

Калі слова з’яўляецца назоўнікам патрэбна пацянуцца ўверх, калі прыметнікам – нахіліцца ўніз і дастаць рукамі падлогу, калі дзеясловам - прысесці.

**9.** ***Гульня “Будзь уважлівы”***

Назаві прадметы мэблі, посуду, школьныя прылады, якія ёсць у класе, падбяры да іх словы-прыметнікі і словы-дзеясловы, прафесіі людзей, якія працуюць у школе і дзеясловы, якія характарызуюць іх асноўны прафесійны занятак.
*Падвядзенне вынікаў работы (самаацэнка і ацэнка настаўніка).*

***10. Гульня “Слоўнікавы клубок”***

- да назоўніка **СОНЕЙКА** падбярыце прыметнік і дзеяслоў;
- да прыметніка **КРУГЛЫ** падбярыце назоўнік і дзеяслоў;
- да дзеяслова **ЛЯЦІЦЬ** – назоўнік і прыметнік.

З кожнай атрыманай групы складзіце сказ і запішыце яго.

*Падвядзенне выніку работы (самаацэнка і ацэнка настаўніка).*

**10.** ***Праца за камп'ютарам***

***Праверыць як навучыліся вылучаць часціны мовы дапаможа заданне на класіфікацыю часцін мовы*** **http://LearningApps.org/1470047**

*Падвядзенне выніку работы (самаацэнка і ацэнка настаўніка).*

**11.** ***Рэфлексія***

Размясціце магніцікі побач са словамі, якія характарызуюць вашу працу на ўроку

Зразумеў
Навучыўся
Стаміўся

**12.** ***Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак***

**13.** ***Дамашняе заданне:***

Практ. 195, стар.75